*Ю.Д.Пярсідская, аспірант*

# ПАРАТЭАТРАЛЬНЫЯ ВІДОВІШЧЫ ЯК НЕАД'ЕМНАЯ ЧАСТКА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА Ў XVI–XVII стст.

Асноўнай часткай мастацкага жыцця беларускага грамадства ў перыяд XVI–XVII стагоддзяў з'яўляўся ўдзел у святкаванні дзяржаўных і рэлігійных урачыстасцей, якія абавязкова ўключалі ў сябе паратэатральныя відовішчы.

Часцей за ўсё сустракаюцца звесткі аб пышных сакральных цырымоніях, прысвечаных святу з царкоўнага календара або іншай аказіянальнай урачыстасці (напрыклад, кананізацыі). Месцам правядзення публічных цырымоній звычайна станавіліся плошчы і вуліцы тых гарадоў, у якіх меліся буйныя храмы і навучальныя ўстановы, паколькі менавіта духавенства і вучні бурсаў, калегіумаў, акадэмій былі галоўнымі арганізатарамі свята. У такіх цырымоніях выкарыстоўваліся элементы розных мастацтваў – дэкаратыўна-прыкладнога, жывапісу, музыкі, скульптуры. Звычайна ўзводзіліся парадныя брамы, па баках якіх ставіліся скульптуры святых, алегарычных вобразаў (чысціні, міласці, дабрадзейнасці), на трыумфальных арках малявалі вобразы святых ці патронаў горада. Студэнты чыталі свае вершы (звычайна на лацінскай мове), складзеныя спецыяльна да свята, ці разыгрывалі непасрэдна перад публікай невялікае відовішча [3].

Паралельна з рэлігійнымі ўрачыстасцямі існавалі і свецкія паратэатральныя дзействы, прызначаныя да такіх гарадскіх свят, як прыезд у гарады іх уладальнікаў ці іншых магнатаў [2]. Вельмі былі распаўсюджаны прывітальныя пышныя цырымоніі, удзельнікамі і гледачамі якіх звычайна з'яўлялася насельніцтва гарадоў і мястэчак. У “Litterae annuae” ад 1608 г. адлюстравана вітанне на плошчы ў Нясвіжы Мікалая Крыштофа Радзівіла вучнямі калегіі. Навучэнцы прымалі ўдзел у спаборніцтве на лепшае складанне вершаў у гонар фундатара. Штогоднік сведчыць, што на плошчы сабраліся жыхары горада і з захапленнем сачылі за прадстаўленнем, а Мікалай Крыштоф Радзівіл, задаволены відовішчам, адказаў вучням удзячнай прамовай [6].

Але іншым разам самі магнаты з усёй сваёй харугвай станавіліся ўдзельнікамі ўрачыстых цырымоній і праходзілі па адной плошчы з

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

мяшчанамі, рамеснікамі, шкалярамі. Гэта адбывалася ў час прыезду вышэйшай дзяржаўнай ці духоўнай асобы, у цырыманіял сустрэчы якіх абавязкова ўключаліся ўзнясенне трыумфальнай брамы і ўрачыстае шэсце гарадскіх цэхаў. Часопіс ад 10 сакавіка 1646 г. прысвечаны апісанню ўрачыстасці з нагоды прыезду ў Варшаву каралевы польскай Людавікі Марыі дэ Ганзаге. Так, за экіпажам каралевы, што складаўся з цудоўных і вельмі прыгожых карэт, ішла конніца. Наступнымі ішлі драгуны пана Зэбжыдоўскага, старасты ланцкароўскага, апранутыя па апошняй польскай модзе; пана Лістхвана, маёра гвардыі каралевы і інш.

Ніводнае свята не абыходзілася без музыкі. На той жа цырымоніі прыбыцця каралевы ў Варшаву на плошчах горада працэсію суправаджалі музыкі Сапегі і Зэбжыдоўскага, а таксама пяхота, якая ішла з "...харугвамі і бубнамі..." (5, 373). У час набажэнства ў касцёле спявала каралеўская капэла. Цікава, як ахарактарызаваў выкананне капэлы інфарматар часопісу: "...клерус вясёла пачаў Te Deum laudamus, якую крыкліва падхапіла капэла" (5, с. 375). На ўрачыстай вячэры ў каралеўскім замку спевакі сядзелі за асобным сталом, недалёка ад фрэйлін каралевы, і "...забаўлялі прытомных канцэртамі..." (5, с. 375). Аднак трэба адзначыць, што падчас агульнагарадскіх свят часцей за ўсё спявалі ўдзельнікі працэсіі і навучэнцы музычных бурсаў, у якіх выкананне гімнаў на святочных цырымоніях уваходзіла ў абавязак.

Паратэатральныя відовішчы арганізоўваліся не толькі ў час агульнагарадскіх свят, але і ў прыватным жыцці магнатаў [4]. Ужо ў канцы XVI ст. прадстаўнікі вышэйшага саслоўя запрашалі да сябе акцёраў з-за мяжы, якія жылі пры двары і забаўлялі гасцей уладара палаца. Так, у падарожным дзённіку Генрыха Вольфа, што паходзіў з Цюрыха і некалькі гадоў працаваў у Рэчы Паспалітай у якасці хатняга настаўніка, змешчаны некаторыя звесткі аб характары мастацкага жыцця вышэйшага саслоўя. Напрыклад, запіс ад 11 лістапада 1573 г. сведчыць, што "...прыехалі італьянскія акцёры пана маршалка Радзівіла і пад наглядам пана практыкаваліся, каб у масках выступіць на вяселлі Паткоўскага" (1, с. 190). Верагодна, маршалак сам удзельнічаў у складанні сцэнарыя выступлення акцёраў на свяце.

Такім чынам, паратэатральныя відовішчы адыгрывалі вельмі важную ролю ў жыцці грамадства: яны выконвалі аб'яднальную функцыю, збіраючы ў час свят на плошчы прадстаўнікоў розных канфесій і саслоўяў, займалі цэнтральнае месца ў правядзенні

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дзяржаўных, рэлігійных цырымоній, праходзячы па адпаведным сцэнарыі.

---

*1. Белы А.* Пэрэгрынацыя, або Кароткае і сціслае апісанне вандраванняў Генрыха Вольфа з Цюрыху: дзённік падарожжа 1570–1578гг. // Спадчына.– №3. – 1998. – С.172–195.

*2. Катлярчук А.* Святочная культура беларускага горада ў XVI – першай палове XVIII ст. у кантэксце ўзаемадзеянняў Захаду і Усходу // Беларусіка = Albaruthenica. – Мн., 1997. – Кн. 6. – Ч. 1. – С. 220–226.

*3. Balinski M.* Dawna akademia Wilenska. – Petersburg, 1862. – 307 s.

*4. Wyczański A.* Szlachta polska XVI wieku. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2001. – 256s.

*5. Zawadzki K.* Początki prasy polskiej. Gazety ułotne i seryjne XVI–XVIII wieku. – Warszawa: Biblioteka Narodowa, 2002. – 440 s.

*6. Litterae* annuae societatis Jesu ex provincia Lusitana, etc. – Anni, 1608. – S. 746–768.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ